Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 4. С. 33–39

*УДК 930.2:003.72(476)«12»*

# АДНАЎЛЕННЕ СЕТКІ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ І АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ЎСЕНАВУЧА Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯАКУПАЦЫЙНЫЯ І ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

**І. А. Андарала,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры менеджменту турызму і гасціннасці БГУФК*

Паступіў у рэдакцыю 10.09.2024.

*UDC 930.2:003.72(476)«12»*

# RESTORATION OF THE SCHOOL EDUCATION NETWORK AND IMPLEMENTATION OF UNIVERSAL EDUCATION IN BELARUS IN THE POST-OCCUPATION AND POST-WAR YEARS

**I. Andarala,**
*PhD in Pedagogic, Associate Professor of the Department of Tourism and Hospitality, BSUPC*

Received on 10.09.2024.

У выніку наступстваў Вялікай Айчыннай вайны і злачынных дзеянняў нямецкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі БССР існаваўшая ў передваенныя гады сетка школьных навучальных устаноў была практычна знішчана. Таму з пачатку вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад нямецкай акупацыі перад партыйна-савецкімі кіруючымі органамі ўсіх узроўняў, наркамасветы, абласнымі, раённымі і гарадскімі аддзеламі народнай адукацыі паўстала выключна важная задача – аднавіць сетку школ і арганізаваць у іх вучэбныя заняткі для дзяцей школьнага ўзросту.
У артыкуле на аснове вывучэння архіўных матэрыялаў прадстаўлены рэтраспектыўны аналіз і ацэнка працэсу аднаўлення сеткі пачатковых, сямігадовых, сярэдніх школ, школ рабочай і сельскай моладзі і ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей школьнага ўзросту ў Беларусі ў пасляакупацыйныя і пасляваенныя гады.

*Ключавыя словы*: агульнаадукацыйная школа, пачатковая адукацыя, сямігадовая адукацыя, сярэдняя адукацыя, усенавуч, сетка школ, кантынгент навучэнцаў.

As a result of the Great Patriotic War consequences and criminale actions of German occupiers in the temporarily occupied territory of the BSSR the network of school educational institutions that existed in the pre-war years was practically destroyed. Therefore, with the beginning of the liberation of the republic’s territory from the German occupation before the party-Soviet bodies of all levels, People’s Commissariat of Education, regional, district and city departments of public education have become extremely important task to restore the network of schools and organize the educational process in them for school age children.
Based on the study of archival materials, the article presents retrospective analysis and assessment of the network of initial, seven-year schools, secondary schools, schools for working and rural youth restoring process, the implementation of universal compulsory education for school-age children in Belarus in post-war years.

*Keywords:* comprehensive school, primary education, seven-year education, secondary education, universal education, network of schools, student population.

*Уводзіны.* Сучасны перыяд у гісторыі Беларусі характарызуецца глыбокімі пераўтварэннямі ва ўсіх сферах жыцця. Гэта істотна ўзмацніла сацыяльную значнасць агульнаадукацыйнай школы, абумовіла яе арыентацыю на новыя рэаліі і мэтавыя ўстаноўкі. Як следства, адной з прыярытэтных задач дзяржавы з’яўляецца забеспячэнне бесперапыннага прагрэсу ў развіцці нацыянальнай агульнаадукацыйнай сферы. Рашэнне гэтай задачы патрабуе распрацоўкі інавацыйнай тэарэтыка-метадалагічнай адукацыйнай палітыкі, пошуку новых, арыгінальных шляхоў і форм трансфармацыі нацыянальнай агульнай сярэдняй адукацыі, адпаведных духу і часу суверэннай Беларусі. У адпаведнасці з новымі гістарычнымі рэаліямі трансфармацыя школьнай адукацыі павінна адбывацца з улікам найбольш каштоўнага з сусветнай адукацыйнай практыкі пры ўмове абавязковага захавання асаблівасцей функцыянавання айчыннай школьнай адукацыі. У гэтым кантэксце несумненную навукова-пазнавальную і практычную каштоўнасць мае гістарычны вопыт аднаўлення сеткі школ і ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей школьнага ўзросту ў Беларусі ў пасляакупацыйныя і пасляваенныя гады.

Трэба адзначыць, што асобныя аспекты функцыянавання школьнай адукацыі Беларусі ў пасляваенныя гады знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях беларускіх вучоных Н. Г. Гнеўкі, М. В. Жарскага, І. М. Ільюшына, Р. Я. Кісялёва, П. В. Саевіча, С. А. Умрэйкі і інш. Аднак аналіз апублікаванай літаратуры дазваляе зрабіць выснову аб тым, што складаны працэс аднаўлення і пашырэння сеткі школ рэспублікі ў спецыфічных сацыяльна-эканамічных умовах пасляваеннага часу застаецца недастаткова даследаваным і не зусім аб’ектыўна асветленым у навуковай літаратуры. Да таго ж у працах нярэдка ўтрымліваюцца супярэчлівыя адзін аднаму звесткі як па змесце падзей, якія адбываліся, так і па колькасных параметрах: аб колькасці школ і навучэнцаў у іх.

*Асноўная частка.* У передваенным 1940/41 навучальным годзе сетка школьнай адукацыі Беларусі налічвала 11 808 школ. З іх пачатко-

вых – 8312; сямігадовых – 2562; сярэдніх – 934. Ва ўсіх тыпах школ навучалася 1 688 481 школьнік. У I–IV класах – 1 160 525; V–VII – 437 591; VIII–X – 90 365 чалавек [1, с. 184].

У выніку наступстваў Вялікай Айчыннай вайны і злачынных дзеянняў нямецкіх захопнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі рэспублікі існаваўшая ў даваенныя гады сетка агульнаадукацыйных школ была практычна знішчана.

Надаючы важнае значэнне аднаўленню школьнай адукацыі на вызваленай тэрыторыі Беларусі, СНК СССР і ЦК ВКП(б) яшчэ 1 студзеня 1944 г. прынялі сакрэтную пастанову «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК ВКП(б)Б», згодна з якой абавязалі партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі «аднавіць у 1944 г. у вызваленых раёнах сетку пачатковых і сярэдніх школ, ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту» [2, с. 37].

Асноўная задача, пастаўленая партыйна-савецкім кіраўніцтвам рэспублікі перад народным камісарыятам асветы, абласнымі, раённымі і гарадскімі аддзеламі народнай адукацыі заключалася ў максімальным аднаўленні існаваўшай да пачатку вайны сеткі школ і забеспячэнні абавязковага ўсенавуча на ўзроўні пачатковага навучання. Таму пры арганізацыі школьнага навучання органы народнай адукацыі на месцах зыходзілі галоўным чынам з неабходнасці стварэння пачатковых школ для дзяцей 8–12-гадовага ўзросту.

Аднаўленне дзейнасці школьных навучальных устаноў у раёнах часткова вызваленых Палескай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей пачалося восенню 1943 г. Намаганнямі мясцовых уладаў, раённых аддзелаў народнай адукацыі, грамадскасці да канца 1943/44 навучальнага года ў рэспубліцы аднавілі сваю дзейнасць 1458 школ з агульнай колькасцю навучэнцаў 147 092 чалавекі, у тым ліку 1146 пачатковых – з кантынгентам навучэнцаў 122 271 чалавек, 267 сямігадовых – 22 798 чалавек і 45 сярэдніх – 2489 чалавек [3, арк. 325]. 78 % аднавіўшых дзейнасць школ былі пачатковымі, пераважна сельскімі.

Школы, якія пачыналі працаваць, размяшчаліся ў часткова адрамантаваных або прыстасаваных памяшканнях, а ў сельскай мясцовасці, у асноўным, у хатах сельскіх жыхароў, зямлянках і бліндажах. Прыстасаваныя пад школы памяшканні не адпавядалі элементарным патрабаванням школьнай гігіены, мелі нязначныя памеры, земляныя падлогі, дрэннае асвятленне. Заняткі праводзіліся без вучэбных планаў, вучэбных праграм, падручнікаў, пісьмовых прылад. Напрыклад, у школах Магілёўскай вобласці кожны вучань малодшых класаў атрымаў на вучэбны год 2 сшыткі, старэйшых класаў – 4 сшыткі [4, арк. 49]. Сур'ёзнай праблемай з'яўлялася дрэннае ацяпленне школьных памяшканняў. У зімовы перыяд у школах было холадна, і вучням даводзілася вучыцца ў верхнім адзенні. Многія школы па прычыне адсутнасці дроў вымушаны былі нават прыпыніць вучэбныя заняткі.

Паколькі школьныя ўстановы аднаўлялі сваю дзейнасць па меры вызвалення тэрыторыі рэспублікі, то ў многіх раёнах навучальны год пачаўся значна пазней за верасень. Як правіла, у гэтых школах новы праграмны вучэбны матэрыял не вывучаўся. На ўроках паўтаралася тое, што вывучалася ў даваенныя гады. У выніку з агульнай колькасці працаваўшых у 1943/44 навучальным годзе школ праграмны матэрыял па вучэбных дысцыплінах быў засвоены толькі ў 586 школах [3, арк. 327]. Іспыты, што праводзіліся вясной 1944 г. ў школах Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў, паказалі, што ва ўмовах адсутнасці падручнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў, нізкай кваліфікацыі настаўнікаў засвоіць праграмны матэрыял на належным узроўні школьнікам не ўдалося. Па гэтай прычыне іспыты ў многіх школах былі адменены [4, арк. 35].

Пытанні, звязаныя з аднаўленнем сеткі і работы агульнаадукацыйных школ, выкананнем усенавуча, рэгулярна разглядаліся на пленумах, бюро камітэтаў партыі, пасяджэннях выканаўчых камітэтаў і былі пад іх непасрэдным кантролем.

Ні ў якім разе не падвяргаючы сумненню маштабнасць і значнасць працы, праведзенай у рэспубліцы ў 1943/44 навучальным годзе па аднаўленні сеткі школ і ахопу навучаннем дзяцей школьнага ўзросту, трэба адзначыць, што, як вынікае з загаду народнага камісара асветы Беларускай ССР Е. І. Уралавай ад 8 сакавіка 1944 г. «Аб ходзе аднаўлення школ у вызваленых раёнах БССР», у справе аднаўлення школьнай адукацыі меліся істотныя недахопы. У прыватнасці, у загадзе адзначалася: «Нездавальняюча пастаўлена работа па выкананні закона аб усенавучы. Вялікая колькасць дзяцей 8–12-гадовага ўзросту ў школах не вучыцца; пры адкрыцці сямігадовых і сярэдніх школ не ўлічваецца наяўнасць памяшканняў, адпаведных педагагічных кадраў, кантынгенту навучэнцаў» [5, арк. 168]. На канец навучальнага года 20 965 дзяцей школьнага ўзросту, якія падлягалі абавязковаму навучанню, па розных прычынах (адсутнасць школьных памяшканняў, настаўнікаў, вопраткі, абутку ў дзяцей і інш.) так і не прыступілі да вучобы [3, арк. 326].

З мэтай актывізацыі аднаўленчых работ і падрыхтоўкі школьных устаноў да пачатку наступнага 1944/45 навучальнага года СНК БССР і ЦК КП(б)Б 18 красавіка 1944 г. прынялі пастанову № 211/5 «Аб аднаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР». Гэты дакумент абавязаў партыйныя і савецкія органы ўсіх узроўняў, народны камісарыят асветы, аддзелы народнай адукацыі рэспублікі прыняць неадкладныя меры па аднаўленні сеткі школьных устаноў ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі і ажыццяўленні сталінскага закону аб усеагульным абавязковым навучанні [6, арк. 226].

Згодна з дадзенай пастановай абласныя камітэты партыі і выканкамы абласных саветаў прынялі адпаведныя сумесныя пастановы, у якіх у разрэзе кожнага раёна былі вызначаны школы, якія неабходна было адкрыць да пачатку 1944/45 навучальнага года, мясцовым уладам і органам народнай адукацыі даручалася правесці ўлік дзяцей школьнага ўзросту.

Пэўную арганізацыйную работу па падрыхтоўцы да навучальнага года правёў наркамасветы рэспублікі. Каб зменшыць востры дэфіцыт педгагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ, летам 1944 г. была арганізавана падрыхтоўка настаўнікаў праз 3-х і 6-месячныя курсы. У выніку ў школы былі накіраваны 1222 настаўнікі [6, арк. 25]. Таксама быў распрацаваны вучэбны план на 1944/45 навучальны год, у школы завезена 200 000 падручнікаў, 950 000 сшыткаў і на 120 000 руб. вучэбна-наглядных дапаможнікаў [3, арк. 312].

Як вынікае з даведкі наркама асветы БССР Е. І. Уралавай сакратару ЦК КП(б)Б В. М. Маліну «Аб стане работы па аднаўленні сеткі культурных устаноў па Беларускай ССР» ад 5 кастрычніка 1944 г., падрыхтоўка школьнай адукацыі да пачатку 1944/45 навучальнага года была паспяхова праведзена. У даведцы адзначалася: «Па ўсёй рэспубліцы быў праведзены ўлік дзяцей школьнага ўзросту (7–15 год). Улічана 1 222 852 чалавекі. За кароткі перыяд адноўлены і пачалі працаваць 10 594 школы, у тым ліку пачатковых 8683, сямігадовых – 1636 і сярэдніх 279, з агульным ахопам навучэнцаў 1 178 039 чалавек. Усе школы працуюць у адрамантаваных, прыстасаваных школьных будынках» [2, с. 210].

Аднак, як паказалі вынікі праверкі, праведзенай брыгадай аддзела школ ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, у шэрагу абласцей рэспублікі на працягу студзеня 1945 года, інфармацыя наркама аб поўнай гатоўнасці школьнай адукацыі рэспублікі да навучальнага года не адпавядала сапраўднасці. Фактычна, патрабаванні пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 18 красавіка 1944 г. за № 211/5 «Аб аднаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР» у частцы аднаўлення сеткі школьных устаноў і ажыццяўлення сталінскага закону аб усеагульным абавязковым навучанні не былі выкананы ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. Многія з запланаваных да адкрыцця школ нават на працягу навучальнага года не змаглі аднавіць сваю дзейнасць, вялікая колькасць дзяцей засталася неахопленай школьным навучаннем.

Так, у сваёй даведцы правяраючыя адзначылі, што ў Пінскай вобласці «ў сувязі з адсутнасцю належнага кіраўніцтва справай народнай адукацыі з боку партыйных арганізацый – стан работы большасці школ нездавальняючы. Закон аб усенавучы не выкананы» [6, арк. 47]. Нават на 30 студзеня 1945 г. у вобласці па розных прычынах не працавалі 87 школ. Паводле дадзеных абласнога аддзела народнай адукацыі, з 61 713 улічаных дзяцей школьнага ўзросту школу наведвалі толькі 51 244 чалавекі. Аднак брыгада аддзела школ ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б адзначыла, што статыстыка, прадстаўленая аблана па выкананні ўсенавуча, не адпавядае сапраўднасці. У адным толькі Давыд-Гарадоцкім раёне вобласці школу не наведвалі 1889 дзяцей школьнага ўзросту [6, арк. 48]. У Драгічынскім раёне ў першым паўгоддзі навучальнага года перасталі наведваць школы 800 чалавек, у Пінскім – 667 чалавек [6, арк. 47].

У Гродзенскай вобласці да пачатку 1944/45 навучальнага года планавалася адкрыць 847 школ – 728 пачатковых, 109 сямігадовых і 10 сярэдніх. Фактычна ж на 1 студзеня 1945 г. у вобласці працавала толькі 738 школ, з іх 637 пачатковых, 94 – сямігадовыя, 8 сярэдніх. Такім чынам, у вобласці не здолелі аднавіць сваю дзейнасць 109 школ, з іх 91 пачатковая школа. З ліку дзяцей школьнага ўзросту вучобай не былі ахоплены 9981 чал., або 11 % ад улічаных [6, арк. 67].

Не лепшым было становішча з аднаўленнем сеткі школ і ажыццяўленнем усенавуча і ў іншых абласцях рэспублікі.

У цэлым па рэспубліцы нават на канец 1944/45 навучальнага года з 10 594 запланаваных да адкрыцця школ працавала толькі 10 130, вучобай было ахоплена 1 052 735 дзяцей школьнага ўзросту з улічаных 1 178 039 [7, арк. 50].

Вынікі праверкі стану аднаўлення сеткі школ і выканання закону аб усенавучы ў рэспубліцы, праведзенай брыгадай аддзела школ ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б вымусілі СНК БССР і ЦК КП(б)Б прыняць 13 жніўня 1945 г. сакрэтную пастанову № 1163-292 с «Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы школ да 1945/46 навучальнага года» [8, арк. 157–159].

З мэтай своечасовай і поўнай падрыхтоўкі да 1945/46 навучальнага года і выканання закона аб усеагульным абавязковым навучанні СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязаў Наркамасветы БССР і яго органы на месцах да 20 жніўня правесці поўны ўлік дзяцей школьнага ўзросту (7–14 гадоў) і ў адпаведнасці з дадзенымі ўліку вызначыць да 25 жніўня бягучага года сетку пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ на 1945/46 навучальны год па кожным раёне з абавязковым зацвярджэннем яе райвыканкамамі і аблвыканкамамі Саветаў дэпутатаў працоўных; аптымізаваць сетку сямігадовых і сярэдніх школ шляхам зліцця школ з неўкамплектаванымі класамі (менш за 10–12 чалавек), да 1 верасня адкрыць для вучняў, якія жывуць далёка ад школы, інтэрнаты на 15–20 чалавек [8, арк. 157].

Трэба адзначыць, што прынятая пастанова ў частцы аднаўлення сеткі школ і выканання закону аб усенавучы ў значнай ступені дубліравала патрабаванні пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б 18 красавіка 1944 г. за № 211/5 «Аб аднаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР», тым самым

пацвярджаючы той факт, што задачы, пастаўленыя ў ёй, не былі выкананы.

Праведзеная да пачатку 1945/46 навучальнага года работа па ўдакладненні і ўпарадкаванні сеткі школ, уліку дзяцей, якія падлягалі навучанню, дазволіла павялічыць колькасць аднавіўшых дзейнасць школьных устаноў, кантынгент навучэнцаў і палепшыць ахоп навучаннем дзяцей школьнага ўзросту. На пачатак першага пасляваеннага года ў рэспубліцы працавала 10 952 школы, у тым ліку 9015 пачатковых школ, 1736 сямігадовых і 331 сярэдняя. Агульны кантынгент навучэнцаў налічваў 1 328 819 чалавек, у тым ліку ў 1–4 класах – 1 145 634, у 5–7 класах – 165 825, у 8–10 класах – 17 360 навучэнцаў [7, арк. 50].

Як вынікае з прыведзенай статыстыкі, большую частку школьных устаноў, аднавіўшых сваю дзейнасць у першы пасляваенны навучальны год, складалі пачатковыя школы – 82 % ад агульнай колькасці. Гэта было абумоўлена наяўнасцю значнай колькасці дзяцей, якія ўпершыню пайшлі ў школу, а таксама дзяцей, навучанне якіх было перапынена вайной. Акрамя таго, у адпаведнасці з пастановай Вярхоўнага Савета СССР аб увядзенні навучання дзяцей з сямігадовага ўзросту ў першыя класы набіраліся дзве ўзроставыя групы вучняў – сямі і васьмі гадоў. Менавіта таму навучэнцы пачатковых класаў складалі 85 % вучнёўскага кантынгенту школ рэспублікі – 1 145 634 з 1 328 819 школьнікаў. Значна меншы працэнт (15,1 %) прыходзіўся на сямігадовыя і, асабліва, на сярэднія школы (2,9 %). Іх адкрыццё стрымлівалася адсутнасцю школьных будынкаў і памяшканняў, неабходнага вучэбна-матэрыяльнага абсталявання і, самае галоўнае, кваліфікаваных педагагічных кадраў, якіх катастрафічна не хапала.

У параўнанні з папярэднім, у 1945/46 навучальным годзе сетка школ рэспублікі павялічылася на 822 адзінкі, або на 8,1 %, у тым ліку пачатковых школ – на 652 адзінкі, або на 23,5 %, сямігадовых – на 245 адзінак, або на 17 % і сярэдніх – на 55 адзінак, або на 20 %. Агульны кантынгент навучэнцаў школ узрос на 276 084 чалавекі, або на 26 %, у тым ліку ў 1–4 класах – на 209 466 чалавек, або на 26 %, у 5–7 класах – на 57 781 навучэнца, або на 53,5 %, у 8–10 класах – на 8837 чалавек, або на 100 % [7, арк. 50].

Прымаючы пад увагу станоўчую дынаміку росту колькасці школ, неабходна адзначыць, што дзяржаўны план пашырэння сеткі школ, даведзены рэспубліцы сакрэтнай пастановай СНК СССР № 400-120 с.с. ад 25 сакавіка 1945 г. «Аб дзяржаўным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі на 1945 г.» аказаўся выкананым толькі ў частцы агульнай колькасці школьных вучэбных устаноў, прычым за кошт адкрыцця звышпланавай колькасці пачатковых школ. Што да сямігодак, то ў адпаведнасці з дзяржаўным планам неабходна было адкрыць 1990 школ, а было адкрыта толькі 1736, або на 254 школы менш. Сетку сярэдніх школ рэспублікі. згодна з планам, трэба было давесці да 350, а была адкрыта 331 школа, або менш на 19 [8, арк. 15].

Аказалася не выкананым і патрабаванне партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі аб аптымізацыі сеткі школ. Шматлікія факты нерацыянальнага размяшчэння сеткі школ мелі месца ва ўсіх абласцях. Асабліва характэрна гэта было для Гродзенскай вобласці. Так, у Поразаўскім раёне гэтай вобласці 3 сямігадовыя школы былі размешчаны на адлегласці 2–3 кіламетраў адна ад другой, пры гэтым напаўняльнасць класаў у гэтых школах была па 5–11 навучэнцаў [7, арк. 51].

Што тычыцца выканання плану, даведзенага раней адзначанай сакрэтнай пастановай СНК СССР па вучнёўскім кантынгенце, то ў цэлым рэспубліка яго выканала і нават перавыканала. Аднак, як і ў выпадку з планам па сетцы школ, гэта ўдалося вырашыць за кошт звышпланавай колькасці навучэнцаў 1–4 класаў. Планы па колькасці навучэнцаў 5–7 і 8–10 класаў аказаліся істотна недавыкананымі. Згодна з планам, у 5–7 класах павінна было вучыцца 205 000 чалавек, а на 1 верасня за парты селі толькі 165 825 (менш на 39 175 чалавек, або на 20 %). У 8–10 класы ў адпаведнасці з планам трэба было прыняць 22 000 школьнікаў, а да вучобы прыступілі толькі 17 360 (менш на 4640 чалавек, або на 21,5 %) [8, арк. 15].

Галоўнай прычынай невыканання планавых паказчыкаў па пашырэнні сеткі сямігадовых і сярэдніх школ і павелічэнні колькасці навучэнцаў у іх, як вынікае з архіўных дакументаў, з'яўлялася нездавальняючая работа мясцовых партыйна-савецкіх органаў, аддзелаў народнай адукацыі і школ. Праведзеныя Наркамасветы рэспублікі праверкі паказалі, што ў 1945/46 навучальным годзе неахоплена вучобай была значна большая колькасць дзяцей, чым паказвалася ў справаздачах абласных аддзелаў адукацыі.

Баючыся пакарання, дырэктары школ, загадчыкі раённых і абласных аддзелаў народнай адукацыі ўтойвалі сапраўдны стан выканання закону аб усеnavучы. Так, згодна інфармацыі, прадстаўленай Гродзенскім аддзелам народнай адукацыі, у вобласці неахопленымі вучобай былі 4000 чалавек, а праверка, праведзеная прадстаўнікамі наркамасветы, выявіла, што ў сапраўднасці школы не наведвала 13 000 дзяцей школьнага ўзросту.

Такое ж становішча было і з адсевам дзяцей са школ на працягу вучэбнага года. Праведзеная праверка паказала, што ў асобных школах Радуньскага, Мастоўскага, Зэльвенскага раёнаў Гродзенскай вобласці адсеў навучэнцаў на працягу навучальнага года дасягаў 40–45 % [7, арк. 51].

Важнае месца ў сістэме школьнай адукацыі ў пасляваенныя гады займалі школы рабочай і сельскай моладзі, задачай якіх было даць агульнаадукацыйную падрыхтоўку той часткі моладзі рэспублікі, якая ва ўмовах вайны і фа-

шысцкай акупацыі была пазбаўлена магчымасці наведваць школу, а пасля вайны была занята на вытворчасці. У першым пасляваенным навучальным годзе ў рэспубліцы працавалі 73 школы рабочай моладзі і 366 школ сельскай моладзі. Рабочыя школы былі пачатковымі, сямігадовымі і сярэднімі. Школы сельскай моладзі давалі толькі пачатковую і сямігадовую адукацыю. Агульная колькасць навучэнцаў у двух тыпах школ складала 21 300 чалавек, адпаведна, 7167 – у школах рабочай моладзі і 14 113 – у школах сельскай моладзі [9, с. 418].

Перспектывы па далейшым пашырэнні сеткі школ і павелічэнні кантынгенту навучэнцаў у іх вызначыў «Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946–1950 гг.», прыняты 8-й сесіяй Вярхоўнага Савета БССР у верасні 1946 г. Згодна закону, прадугледжвалася «давесці колькасць пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ у 1950 годзе да 1375, у тым ліку пачатковых – да 7105, сямігадовых – да 3 270 і да 1000 сярэдніх з агульнай колькасцю навучэнцаў у іх да 1,5 млн чалавек, што ў параўнанні з 1946 г. павінна было даць павелічэнне па сямігадовых школах на 1401 адзінку, або на 170 %, па сярэдніх школах на 591 школу, або на 250 %, забяспечыўшы усеагульнае абавязковае навучанне дзяцей з сямігадовага ўзросту як у горадзе, так на сельскай мясцовасці» [10, арк. 107].

Пасля прыняцця вышэйадзначанага закону сетка сямігадовых і сярэдніх школ і кантынгент навучэнцаў у іх мелі станоўчую дынаміку. У 1947/48 навучальным годзе ў рэспубліцы ўжо працавала 11 701 школа. З іх пачатковых – 9247, сямігадовых – 1984, сярэдніх – 470. У параўнанні з папярэднім 1946/47 навучальным годам колькасць пачатковых школ узрасла на 259 адзінак, сямігадовых – на 192, сярэдніх – на 97 адзінак. Аднак, што да выканання плана па адкрыцці сеткі школ у 1947/48 навучальным годзе, зацверджаным Саветам Міністраў БССР, сямігадовых школ працавала больш, чым запланавана, на 24 і, наадварот, на 5 сярэдніх школ менш [8, арк. 206]. Сетка пачатковых школ у гэтым навучальным годзе дасягнула свайго максімуму – 9247 навучальных устаноў. У наступныя гады колькасць пачатковых школ і колькасць навучэнцаў у іх паступова змяншаюцца.

Існуючая сетка пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ дазваляла ў поўным аб'ёме забяспечыць выкананне закону аб усеагульным абавязковым навучанні дзяцей 7–15-гадовага ўзросту і ахапіць максімальную колькасць выпускнікоў IV класаў навучаннем у V–VII класах [10, арк. 206].

Трэба адзначыць, што колькасны рост сямігадовых і сярэдніх школ не заўсёды суправаджаўся павышэннем якасці вучэбна-выхаваўчай работы. Школы нярэдка ўзнікалі стыхійна, без уліку запатрабаванняў і магчымасцей раёна, вобласці. Размяшчаліся яны нераўнамерна. Так, у Лідскім раёне ўсе сямігадовыя і сярэднія школы былі размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы раёна, а ў паўднёва-ўсходняй частцы не было ніводнай сямігадовай і сярэдняй школы [10, арк. 110].

Істотныя змены адбыліся і ў колькасных паказчыках па кантынгенце навучэнцаў. Агульная колькасць школьнікаў, у параўнанні з папярэднім навучальным годам, зменшылася. Гэта адбылося па прычыне памяншэння колькасці школьнікаў пачатковых класаў. Кантынгент жа навучэнцаў у 5–7 і 8–10 класах узрос на 14 544 і на 3478 навучэнцаў адпаведна [10, арк. 206]. Змяншэнне колькасці навучэнцаў пачатковых класаў тлумачыцца тым, што пачаўся набор і прыём у школу дзяцей, якія нарадзіліся ў ваенныя і першыя пасляваенныя гады, для якіх была характэрна нізкая нараджальнасць.

Нягледзячы на адзначаную станоўчую дынаміку па агульнай колькасці навучэнцаў, выканаць устаноўленыя Саветам Міністраў планавыя паказчыкі па прыёме ў V і VIII класы не атрымалася. У 1947/48 навучальным годзе, згодна з народнагаспадарчым планам, у V класы трэба было прыняць 111 000 выпускнікоў IV класаў, а прынялі 87 700 (79 % ад плана); у VIII класы трэба было прыняць 14 000 навучэнцаў, закончыўшых сем класаў, а было прынята 11 684 (83 % ад плана) [10, арк. 207]. Міністэрства асветы рэспублікі недавыкананне планавых паказчыкаў тлумачыла тым, што выпускнікі 5-х класаў, пераважна пераросткі, паступалі ў рамесныя вучылішчы і ФЗН, а выпускнікі 7-х класаў – у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Як і ў папярэднія гады, у 1947/48 навучальным годзе закон аб усенавучы выконваўся нездавальняюча. Па няпоўных дадзеных, не былі ахоплены навучаннем 71 914 дзяцей школьнага ўзросту. Асабліва дрэнна выконваўся ўсенавуч у заходніх абласцях рэспублікі. Так, у Гродзенскай вобласці неахопленымі вучобай засталіся 18 000 дзяцей. Не лепш ішло выкананне закону ў Брэсцкай і Пінскай абласцях [10, арк. 208].

Значным крокам наперад у развіцці сеткі школ быў часавы адрэзак з 1947/48 па 1951/52 навучальныя гады, калі завяршалася ўвядзенне ўсеагульнага пачатковага навучання і, у адпаведнасці з рашэннем XIX з'езда КП(б)Б, пачынаўся пераход школьнай адукацыі рэспублікі да ўсеагульнага абавязковага сямігадовага навучання. Ён з'явіўся перадумовай рэарганізацыі школ і абумовіў тэндэнцыю ўзбуйнення навучальных устаноў.

У гэтыя гады сетка сямігадовых і сярэдніх школ няўхільна расла, была праведзена значная работа па іх рацыянальным тэрытарыяльным размяшчэнні, ахопу выпускнікоў 4-х класаў навучаннем у 5-х, выпускнікоў 7-х класаў – у 8-х.

Адкрыццё новых сямігадовых навучальных устаноў звычайна ажыццяўлялася шляхам пераўтварэння існаваўшых пачатковых школ у сямігодкі. Гэта не прадугледжвала асаблівых

затрат на будаўніцтва школьных памяшканняў, паколькі ў асноўным выкарыстоўваліся класныя пакоі пачатковых школ. Варта адзначыць, што рэарганізацыя пачатковых у сямігадовыя школы насіла сістэмны характар. Пачаўшыся ў 1947/48 навучальным годзе, яна мела свой пік у 1951/52 навучальным годзе. За гэты час колькасць сямігодак узрасла з 1984 да 2935, або на 48 %.

Staноўчай была і дынаміка росту сярэдніх школ рэспублікі. З 1947/48 па 1951/52 навучальны год сетка дзесяцігодак пашырылася з 470 да 899, або на 91 %. Да арганізацыі сярэдніх школ прад'яўляліся пэўныя патрабаванні: размяшчэнне ў асобных будынках, наяўнасць адпаведных вучэбных (фізічных, хімічных, біялагічных і інш.) кабінетаў, майстэрняў, абсталявання, актавай і спартыўнай залы, сталовай, кваліфікаванага настаўніцкага складу.

У адзначаныя гады адбыліся істотныя змены і ў колькасці вучнёўскага кантынгенту школьных навучальных устаноў. У 1951/52 навучальным годзе колькасць навучэнцаў 5–7 класаў склала 585 812 чалавек (павелічэнне ў параўнанні з 1947/48 годам на 303,6 %), у 8–10 класах – 98 937 чалавек (павелічэнне ў параўнанні з 1947/48 годам на 426,6 %).

У выніку адукацыйнай палітыкі па аднаўленні і развіцці педагагічнай адукацыі, якая праводзілася кіраўніцтвам рэспублікі ў першыя пасляваенныя гады, да 1951 г. была створана шырокая сетка педагагічных навучальных устаноў, якая ў значнай меры забяспечвала патрэбы ўсіх ступеняў агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў кваліфікаваных настаўніках усіх спецыяльнасцяў. Паміж існуючымі тыпамі педагагічных навучальных устаноў існавала дакладная дэферэнцыяцыя прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі. Педагагічныя інстытуты ажыццяўлялі падрыхтоўку настаўнікаў для VIII–X класаў, настаўніцкія інстытуты – настаўнікаў для V–VII класаў, педагагічныя вучылішчы – настаўнікаў пачатковых класаў.

У 1951/52 вучэбным годзе падрыхтоўку настаўнікаў для VIII–X класаў забяспечвалі 8 педагагічных інстытутаў (28 факультэтаў), настаўнікаў для V–VII класаў – 7 настаўніцкіх інстытутаў (19 аддзяленняў), настаўнікаў пачатковых класаў – 24 педагагічныя вучылішчы.

Трэба адзначыць, што закон аб абавязковым усеагульным сямігадовым навучанні ў рэспубліцы яшчэ выконваўся нездавальняюча.

Выбарачная праверка, праведзеная Статыстычным упраўленнем Беларускай ССР у верасні 1951 г. 240 школ рэспублікі па якасці ўліку дзяцей школьнага ўзросту і ахопу іх школай паказала, што з 34 599 дзяцей і падлеткаў ва ўзросце 7–15 гадоў нідзе не вучыліся 948 чалавек [11, арк. 70]. Асабліва многа дзяцей школьнага ўзросту не наведвала школу ў Магілёўскай, Маладзечненскай, Полацкай, Баранавіцкай абласцях.

Многія дырэктары школ у справаздачах штучна памяншалі дадзеныя аб колькасці дзяцей, неахопленых вучобай. Так, на тэрыторыі Хойніцкай пачатковай школы Палескай вобласці не наведвалі школу 15 дзяцей і падлеткаў, а ў справаздачы быў паказаны адзін чалавек [11, арк. 70].

Правяраючыя зрабілі выснову, што такое становішча з ахопам дзяцей усенавучам з'явілася следствам таго, што выканкамы абласных і раённых саветаў працоўных не забяспечылі правядзенне ўсіх мерапрыемстваў, накіраваных на поўны ахоп дзяцей навучаннем [11, арк. 71]. Сюды трэба аднесці недакладны ўлік дзяцей і падлеткаў, якія падлягалі навучанню, адсутнасць у многіх школах фондаў усенавуча, інтэрнатаў пры сямігадовых і сярэдніх школах. Усяго ў рэспубліцы на 1 верасня 1950 г. было арганізавана 68 інтэрнатаў на 1493 месцы замест 100 інтэрнатаў на 2500 месцаў згодна з планам [11, арк. 72].

Значны ўклад у ажыццяўленне сярэдняй адукацыі ў гарадах і рабочых пасёлках і сямігадовай – у сельскай мясцовасці ў другой палове 1940-х пачатку 1950-х гг. унеслі школы рабочай і сельскай моладзі.

Кіруючыся рашэннямі ЦК КП(б)Б ад 2 красавіка 1946 г. «Аб мерапрыемствах па паляпшэнні работы школ рабочай і сельскай моладзі» і ад 15 красавіка 1947 г. «Аб рабоце школ рабочай і сельскай моладзі», партыйныя і савецкія арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы разгарнулі арганізацыйную работу па ўключэнні ў вячэрняе навучанне моладзі, якая не мела сямігадовай, сярэдняй, а падчас і пачатковай адукацыі.

Агульная колькасць школ для моладзі ў 1950/51 навучальным годзе ў параўнанні з 1945/46 навучальным годам павялічылася з 439 да 944, або больш чым у два 2 разы. За гэты перыяд сетка школ рабочай моладзі пашырылася на 177 адзінак і склала 230 навучальных устаноў. Кантынгент навучэнцаў у іх узрос у 3 разы і склаў 30 764 чалавекі. Колькасць школ сельскай моладзі павялічылася на 548 адзінак, або ў 2 разы. Яна налічвала 714 навучальных устаноў. Кантынгент навучэнцаў у іх налічваў 23 401 чалавек. [9, с. 418]. Да пачатку 50-х гг. адбыліся істотныя змены і ва ўзроставым складзе навучэнцаў. Калі ў сярэдзіне 1940-х гг. навучэнцамі школ была моладзь ад 15 да 29 гадоў, прадстаўленая па ўзросце раўнамерна, то ў 1950/51 навучальным годзе назіраўся іншы малюнак: значная частка навучэнцаў у школах працоўнай моладзі была 17–22-гадовага ўзросту, а школы сельскай моладзі наведвалі навучэнцы ва ўзросце 15–22 гадоў. Разбежка ва ўзросце навучэнцаў тлумачыцца тым, што школы сельскай моладзі давалі толькі пачатковую або сямігадовую адукацыю.

*Заключэнне.* З пачатку вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецкай акупацыі аднаўленне школьнай адукацыі і рэалізацыя ўсенавуча разглядаліся партыйна-савецкім кіраўніцтвам рэспублікі як найважнейшая дзяржаўная задача палітычнага, гаспадарчага і абароннага

значэння. Вывучэнне і аналіз гістарычных матэрыялаў сведчаць аб тым, што намаганнямі партыйна-савецкіх органаў усіх узроўняў, наркамасветы, аддзелаў народнай адукацыі, грамадскасці ў складаных сацыяльна-эканамічных умовах ваенных і першых пасляваенных гадоў была праведзена вялікая работа па аднаўленні сеткі пачатковых, сямігадовых, сярэдніх школ, школ рабочай і сельскай моладзі, ажыццяўленні ўсеагульнай абавязковай адукацыі дзяцей школьнага ўзросту.

Аднак выканаць планавыя заданні, вызначаныя Законам аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1946–1950 гг. па пашырэнні сеткі сямігадовых і сярэдніх школ, як і па павелічэнні кантынгенту навучэнцаў у іх, рэспубліцы не атрымалася нават у 1951/52 навучальным годзе.

### Літаратура


1. *Ільюшын, І. М.* Народная асвета ў Беларускай ССР / І. М. Ільюшын, С. А. Умрэйка. – Мінск : Вуч-пед выд-ва МА БССР, 1957. – 357 с.
2. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы : в 2 кн. / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2004. – Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944. – 398 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 21.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 29.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 32.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 28.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 43.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42 сч.. Воп. 6. Спр. 6.
9. Народное хозяйство БССР. Статистический сборник. Госиздат БССР. – Минск, 1963 – 450 с.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 57.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 69.


### References


1. *Il'yushyn, I. M.* Narodnaya asveta ŭ Belaruskaj SSR / I. M. Il'yushyn, S. A. Umrejka. – Minsk : Vuch-ped vyd-va MA BSSR, 1957. – 357 s.
2. Osvobozhdennaya Belarus'. Dokumenty i materialy : v 2 kn. / sost.: V. I. Adamushko [i dr.]. – Minsk, 2004. – Kn. 1. Sentyabr' 1943 – dekabr' 1944. – 398 s.
3. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 21.
4. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 29.
5. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 32.
6. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 28.
7. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 43.
8. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 42 sch.. Vop. 6. Spr. 6.
9. Narodnoe hozyajstvo BSSR. Statisticheskij sbornik. Gosizdat BSSR. – Minsk, 1963 – 450 s.
10. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 57.
11. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 4 p. Vop. 17. Spr. 69.


ВВЕДДПУ